

Інфармацыйная культурна-грамадская газета Гарадоччыны

ГАСЦІНЕЦ

№ 4 (229) САКАВІК 2017 ГОДА

БЕЛАРУСКІЯ АФАРЫЗМЫ

Без радзімы народа няма, Без народа няма Радзімы

Рыгор Барадулін

РЫНАК ПРАЦЫ

ТРЭЦЬ ВАКАНСІЙ — НЕ НА ПОЎНУЮ СТАЎКУ

У Гарадоцкім раёне ў базе даных Дзяржаўнай службы занятасці захавалася прыкладна тая ж колькасць вакансій, як і ў папярэднія месяцы. Пры гэтым асноўнымі ўладальнікамі вакансій застаюцца аддзелы Гарадоцкага райвыканкаму: аддзел адукацыі, спорту і турызму, аддзел ідэалагічнай працы, культуры і па справах моладзі пераважна з няпоўнай занятасцю ад 0,16 стаўкі да 0,6 стаўкі.

Усяго па стану на 12 сакавіка ў базе даных Дзяржаўнай службы занятасці па Гарадоцкаму раёну 159 вакансій. З гэтых 159 вакансій больш 50 прапануюцца на няпоўны працоўны дзень. І ўнесены яны ў базу толькі таму, што наймальнікі павінны ўтрымліваць людзей на адну голую стаўку, а нагрузку вышэй стаўкі паказваць у базе даных. Відавочна, што гэта стварае пэўныя нязручнасці шукальнікам вакансій дзеля якіх фактычна трэба зменшыць заробкі працуючым.

Галоўным прапаноўцам вакансій ў базе з'яўляецца Гарадоцкі аддзел адукацыі, спорту і турызму дзе падобных вакансій — 31. Тут з'явілася такая новая вакансія, як архіварыус на 0,5 стаўкі, а таксама шукаецца памочнік выхаваценя на 0,16 стаўкі з заробкам у 42,40 руб. На другім месцы , аддзел ідэалагічнай працы, культуры Гарадоцкага райвыканкаму з 25 вакансіямі, якія пераважна існуюць у сферы культуры. Трэццяе месца ў Цэнтральнай раённай бальніцы з 18 вакансіямі, якія ўнесены ў базу даных яшчэ 12 снежня мінулага году.

Дарэчы спраўна робіць абнаўленне сваіх базаў даных найперш свінагадоўчы комплекс «Паўночны», які абнавіў базу даных 9 сакавіка на 12 вакансій і Гарадоцкі аддзел адукацыі — абнаўленне зроблена 7 сакавіка. І зусім забылася пра абнаўленне базы даных Гарадоцкая санстанцыя. У гэтай установе даныя не абнаўляліся з 7 жніўня 2016 году.

Паводле даных Нацыянальнага статыстычнага камітэту ў Гарадоцкім раёне ў студзені было 104 афіцыйных беспрацоўных, а новых працоўных месцаў за мінулы год створана аж 120.

Л. Антонаў

КРЫЗІС

ПРАМЫСЛОВАЯ ВЫТВОРЧАСЦЬ ЗНІЗІЛАСЯ

Па дадзеных Нацыянальнага статыстычнага камітэта за студзень 2017 года прамысловая вытворчасць у Гарадоцкім раёне склала толькі 42,3 % ад узроўня вытворчасці ў студзені 2016 года. А ў рэальным валютным кошце вытворчасць упала ніжэй пяцігадовай даўнасці.

Нацыянальны стакамітэт паведаміў, што ў 2017 годзе за студзень у Гарадоцкім раёне было выраблена прадукцыі на 1,1 млн. рублёў, а за студзень мінулага году было выраблена на 2,6 млн. рублёў. Фактычна ў беларускіх рублях вытворчасць зменшылася катастрафіна амаль у 2,5 разы. Пры гэтым запасы гатовай прадукцыі на складах зменшыліся не істотна: калі ў мінулым годзе на складах было 11,8% ад выробленага, то ў гэтым годзе ў студзені маецца 8,6%.

Калі ж паглядзець на афіцыйную дынаміку прамысловай вытворчасці ў Гарадоцкім раёне за мінулае пяцігоддзе, то па першаму месяцу года выяўляецца наступная карціна. З 2012 года колькасць выраблаенмай у прамысловасці прадукцыі расла з 0,59 млн. дэнамінаваных рублёў за студзень 2012 года да 2,6 млн. орублёў у студзені 2016 года.

Але пры ацэнцы вытворчасці ў Гарадоцкім раёне варта ўлічваць гэтую прадукцыю ў больш цвёрдай валюце. Бо агульнавядома, што інфляцыя ў Беларусі біла рэкорды не толькі ў СНД, але набліжалася і да сусветных. Мусіць толькі не даганяла ў інфляцыі афрыканскае Зімбабвэ. І сітуацыя щ цвёрдай валюты — далярах — пры прамысловай вытворчасці ў раёне наступная. Пры курсе даляра адпаведна стаўкі Нацбанка на 30 студзеня папярэдняй гадоў прадукцыі ў далярах было выраблена ў такіх памерах: 2017 год — на 567 тыс. дал., 2016 г. — 1 млн.347 тыс. дал, 2015 г. — 1 590 тыс. дал., 2014 г. — 1 990 тыс. дал., 2013 г. — 1 745 тыс. дал., 2012 г. — 704 тыс. дал..

Такім чынам за студзень месяц за пяцігодку рэальна было выраблена найбольшая колькасць прадукцыі ў 2014 годзе — на 1 990 тысяч даляраў, а найменшая — у гэтым годзе — 569 тыс. даляраў, што ніжэй узроўня 2012 года.

Леанід Гаравы

ЗНАЧНА БОЛЬШ НАВІНАЎ ПРА ГАРАДОК НА HARADOK.INFO

АПЫТАННЕ

ПРАГАЛАСАВАЛІ ЗА СЫХОД З ПАСАДЫ ПРЭЗІДЭНТА

У нашых супольнасцях у сетках Укантакце і Аднакласніках праводзілася апытанне " Ці павінен А.Р. Лукашэнкі сыйсці з пасады прэзідэнта?". 258 удзельнікаў апытання з 343 прыняўшых удзел у апытанні выказаліся за сыход А.Р. Лукашэнкі з пасады прэзідэнта.

У панядзелак 27 лютага мы ў другі раз звярнуліся да ўдзельнікаў нашых груп з сацыяльных сетак з прапановай адказаць на пытанне: " Ці павінен А.Р. Лукашэнкі сыйсці з пасады прэзідэнта?". Варыянты прапаноўваемых адказаў былі: Не, ён добры кіраўнік; Не, ён захоўвае стабільнасць; Так, бо жыццё народа пастаянна пагаршаецца; Так, бо не здольны вывесці краіну з крызісу; Мне ўсё роўна.

Па стану на 9 гадзін 4 лютага ў ананімным галасаванні прыняла ўдзел: 266 чалавек у групе Укантакце — https://vk.com/haradok і 77 чалавек — у Аднакласніках — https://ok.ru/novostigorodka .

Усяго наведвальнікі груп прагаласавалі так: Не, бо ён добры кіраўнік — 15; Не, бо ён захоўвае стабільнасць — 26; Так, бо жыццё народа пастаянна пагаршаецца — 186; Так, бо не здольны вывесці краіну з крызісу — 72; Мне ўсё роўна — 44.

Такім чынам за сыход А.Р. Лукашэнкі з пасады прэзідэнта выказалася 258 нашых чытачоў. Адпаведна гэта вынікі апытання толькі тых чытачоў, якія вырашылі прыняць удзел у апытанні і яго вынікі не могуць быць рэпрэзэнтатыўнымі для Гарадка або раёна.

Дзякуй усім ўдзельнікам апытання!

Леанід Гаравы

ПАЖАР

ПАМЁР У БАЛЬНІЦЫ

14 сакавіка ў 12-17 у МНС Гарадоцкага раёна паступіла паведамленне аб пажары ў кватэры па вул. Савецкай у в. Бычыха Бычыхінскага сельсавета.

Гаспадар, 1960 г. н, інвалід 2-й групы па апорна-рухальнаму апарату, пражывае з жонкай, 1957 г. н. На момант пажару гаспадыня дома адсутнічала.

У 12-21 работнікамі МНС у складзе звяна ГДЗС вынесены гаспадар кватэры, калі мужчыну выявілі ў пакоі на ложку. Пасля агляду лекарамі хуткай медыцынскай дапамогі з дыягназам атручэнне прадуктамі гарэння і апёкамі 1-3 ступені (25% цела) верхніх і ніжніх канечнасцяў шпіталізаваны ў ДУАЗ "Гарадоцкая ЦРБ".

На наступны дзень 15 сакавіка мужчына памёр у бальніцы.

Прычына пажару высвятляецца.

Т. Гаражанка

ТАКІЯ ЛІЧБЫ

НАРАДЗІЛАСЯ У ТРЫ РАЗЫ БОЛЕЙ

Прапануем увазе чытачоў статыстычныя даныя пра жыццё Гарадоцкага раёна з 30 студзеня па 26 лютага гэтага года на падставе інфармацыі з рубрыкі «Тыдзень у лічбах», якая вядзецца газетай «Гарадоцкі веснік».

Паводле даных раёнкі з 30 студзеня па 26 лютага на Гарадоччыне было зафіксавана:

Шлюбаў — 6; Разводаў — 6; Народжана дзяцей — 14; Смярцей — 37; Пажараў — 1;

Злачынстваў — 12; Дарожна транспартных здарэнняў — 16; Выклікаў Хуткай дапамогі — 700;

Выклікаў міліцыі — 343.

З гэтых лічбаў за люты звяртае ўвагу на сябе дзве акалічнасці. Па першае, у лютым нарадзілася ў Гарадоцкім раёне амаль у тры разы болей дзяцей, чым у студзені: у першым месяцы народжана 5 дзяцей, а ў другім — 14. Па другое, калі ў студзені адбылося 7 пажараў і загінуў на іх адзін чалавек, то ў лютым быў зафіксаваны толькі 1 пажар. Варта адзначыць, што 6 пажараў у студзені адбылося ў перша йпалове месяца пад час святкавання Новага года і Раства.

Астатнія лічбы лютага блізкія да лічбаў студзеня.

Л. Антонаў

Аб'ява

Аператыўная інфармацыя аб падзеях Гарадоччыны, рэгіёна і больш, чым у газеце, зараз па-беларуску і па-расейску з'яўляецца на новым Інтэрнэт рэсурсе: http://haradok.info

****

Наша газета "Гасцінец" пачала размешчацца на партале http://haradok.info ў раздзеле "Газета "Гасцінец", дзе стварэацца архіў за мінулыя гады.

****

Каб атрымліваць кожны нумар газеты «Гасцінец» паведаміце рэдакцыі аб гэтым – і вы яго атрымаеце. Калі ўжо не жадаеце атрымліваць выданне, то патэлефануйце у рэдакцыю.

САЦЫЯЛЬНЫЯ ПАСЛУГІ

НАВЕДВАННЕ ЛАЗНЯЎ ЗМЕНШЫЛАСЯ Ў ДВА РАЗЫ

Пастанова № 8 Савета Міністраў ад 11 студзеня 2016 года выключыла грамадскія лазні з пераліку сацыяльна істотных паслугаў. Гэта прывяло да росту білетаў у лазні ў два разы, а таксама да адпаведнага змяншэння наведвальнасці чатырох лазняў на 54,8%.

«Гарадоцкі веснік» напісаў аб наступствах Пастановы № 8 Саўміна для насельніцтва Гарадоцкага раёна ў артыкуле «Баня — мать вторая: кости распарит, всё дело поправит». Утрыманне чатырох лазняў у раёне — Гарадку, Езярышчы, Бычысе, Пальмінцы — увесь час было стратнай справай. І калі раней адбывалася субсідзіраванне працы лазняў, то з мінулага года яно не дзейнічае і Гарадоцкае КУВП «ГПК і ЦС» панесла страты на 55 600 рублёў, зарабіўшы на квітках і паслугах 29 800 рублёў.

Справа палягае ў тым, што за наведванне лазні кошты напачатку 2016 года павялічылі прыкладна ў два разы: да 6 рублёў у горадзе і 5 рублёў на раёне. Такія кошты апынуліся не па сілам былым наведвальнікам лазняў і яны масава спынілі паходы ў лазні. Калі ў 2015 годзе ў чатырох лазнях было зафіксавана 10 328 наведвальнікаў, то ў мінулым годзе толькі 5625 — менш на 54,8%. Адпаведна ў Гарадку за год набыта толькі 4387 пры насельніцтве болей 12 тысяч, а ў Бычысе — 112 білетаў за год пры насельніцтве ў 522 чалавека: толькі пятая частка пабывала ўлазнях раз (!) уза год.

Пры гэтым дзеля змяншэння стратаў камунальнае прадпрыемства на вёсцы скараціла час працы лазняў у чатыры разы. Калі раней лазні працавалі прыкладна восемь дзён на месяц, то зараз толькі два дні: адзін дзень праз два тыдні, калі першая палова дня — жаночая, а другая — мужчынская. Прынятыя меры дазволі зменшыць страты прадпрыемства больш чым на 24 тысячы рублёў.

Але гэта не вырашыла праблему. Відавочна, што дзяржава павінна вярнуць лазні ў пералік сацыяльна значных паслугаў. Бо як кажуць варт апа адзёжцы працягваць ножцы. Нашы улады выдзеляюць вялікія сумы на ўсякія ганарары расейскім поп-зоркам, вядуць утрыманне лядовых палацаў, будуюць рэзідэнцыі кіраўніка, а для простых грамадзян не могуць стварыць умовы для нармальнага мыцця. Гэта магчыма калі ўлада не думае пра народ і лічыць яго прадстаўнікоў непаўнавартаснымі, не годнымі быць людзьмі.

Леанід Гаравы

ДЗЯРЖАЎНЫ ТРАНСПАРТ

КУЛЬГАЕ ЯКАСЦЬ ПАСЛУГ ДЗЯРЖАЎНЫХ ПЕРАВОЗЧЫКАЎ…

Напэўна, я занадта пераборлівая. Не веру чалавеку, які калісьці падвёў. Не люблю хадзіць у той магазін, дзе аднойчы падманулі. Не буду рабіць прычоску ў майстра, піхнуўшага ў мяне нажніцамі. А вось у камандзіроўкі ўсё роўна ездзіць прыходзіцца. Нягледзячы на горкі вопыт аварый і нядобранадзейных пасажырскіх перавозчыкаў. Карэспандэнтка «Рэспублікі» апавядае пра дыскамфорт паездкі па маршруту Віцебск — Вялікія Лукі да Езярышча і яшчэ двух паездак...

Не, вядома, нельга ўсіх стрыгчы пад адзін капыл. Але і супраціўляцца самому сабе складана, калі табой падспудна кіруе трывожны недавер. Як у тым анэкдоце: лыжкі-то знайшліся, але асадак застаўся ...

І не толькі застаўся, а яшчэ і ўзмацніўся падчас трох маіх апошніх паездак.

Такім чынам, 18 студзеня рана раніцай еду ў гарпасёлак Езярышча Гарадоцкага раёна, каб даведацца, як зімуюць жыхары самага паўночнага рэгіёну краіны. Рэйс міжнародны — Віцебск — Вялікія Лукі. Да пасадачнай платформе віцебскага аўтавакзала пад'язджае відалы невялічкі аўтобус. Саджуся бліжэй да рухавіка — на вуліцы мароз. Рушылі.

На вуліцы — начная цемра, слабы сняжок. Злёгку сонная, у шматслоўе шафёра асабліва не ўнікаю. Рэакцыя спрацоўвае толькі тады, калі разумею: аказваецца, мы адправіліся ў шлях са «сляпой» фарай наперадзе і непрацуючымі габарытамі ззаду. Плюс да ўсяго кіроўца ніяк не можа разабрацца з печкай — шкло замярзае, ён раз-пораз спрабуе «прадзіраць» акенца наперадзе, каб сачыць за дарогай. Мае адчуванні? Як у малакіруемай падводнай лодцы. Шафёр супакойвае: хутка світанак, будзе прасцей. Але пакуль гэтага не здарылася, сяджу як на іголках. Са страхам праводжу вачыма цьмяныя агні сустрэчных машын, мітуслівыя недзе там, за пакрытым тоўстым пластом лёду лабавым шклом. «Спраў-та — правую фару на левы бок перакінуць! — Думаючы, падобна, пра зваротную дарогу, працягвае супакойваць, але ўжо не мяне, а сябе кіроўца. — Ды і даішнікі так рана на дарогу не выходзяць. І ўвечары да Невеля, лічы, будзе яшчэ светла ... А там, глядзіш, і мяжа побач ... »

Літаральна праз тыдзень, 25 студзеня, адпраўляюся ў Наваполацк. Мікрааўтобус які праходзіць, едзе ў горад нафтаперапрацоўшчыкаў з Оршы. Адразу непрыемна ўразілі «пратаптаныя» сядзенні. Адчуванне — як быццам сядзіш на старым-старым ложку з паламанай металічнай сеткай. Для спіны нават здаровага чалавека, вымушанага правесці ў такім стане каля двух гадзін, — сур'ёзнае выпрабаванне. У дадатак да гэтага ў салоне жудасна холадна. Стала стукаць нагой аб нагу, прашу кіроўцы ўключыць печку. Той абяцае: праз пару хвілін ўключу. Чаму гэтага нельга зрабіць адразу, не тлумачыць. Напэўна, ліміт ... Чакаю. Праходзіць не менш за дваццаць хвілін, перш чым з'явілася цёпла. На зваротным шляху вырашаю ехаць больш камфортна і, праігнараваўшы «незгаворлівы» мікрааўтобус (ён таксама ў гэты час вяртаўся назад), ўсаджваюся ў цёплым вагоне дызель-цягніка Полацк — Віцебск.

Мабыць, гэтыя інцыдэнты так і засталіся б у памяці невялікі кляксай, якую ўбачыла папера. Але нядаўна пры 20-градусным марозе я зноў адправілася ў камандзіроўку. У Оршу. Як звычайна, білет ўзяла загадзя. На пасадачнай платформе пасажыраў няшмат — чакаем транспарт разам з незнаёмай дзяўчынай. Падобна на тое, студэнткай. Двойчы горда адбіваем атаку прыватнікаў, якія прапануюць здаць набытыя квіткі і ехаць з імі ў камфортным аўто. Тыя настойваюць: аўтобус ідзе вельмі доўга, яшчэ, маўляў, пашкадуеце. Але мы — ўстойлівыя патрыёты дзяржаўных перавозак. Да таго часу, пакуль па гучнай сувязі не абвяшчаюць: рэйс на Оршу затрымліваецца. Паскакаўшы яшчэ хвілін пяць на марозе, здаёмся: а раптам яго наогул адменяць? І бяжым грэцца ў прыватны «мікрік», дзе ўжо сядзіць каля дзесяці аршанскіх пасажыраў. Яны былі разумнейшыя і, мяркуючы па ўсім, нават з самага пачатку не разглядалі варыянт паездкі на рэгулярным грамадскім транспарце. Напэўна, у іх ужо быў час ў ім расчаравацца ...

У чым соль гэтых разважанняў? Я па-ранейшаму за дзяржаўнага перавозчыка. А вось ён, цікава, за каго?

(скарочана)

Алена Бегунова
www.sb.by

НАША ЖЫЦЦЁ

ЗАКОН СОХРАНЕНИЯ ВОДЫ

Еще лет 25 — 30 назад водозаборные колонки были приметой цивилизации и бытовых удобств почти во всех городках и поселках. Их устанавливали на улицах, во дворах. Колхозы обустраивали колонки хозспособом. И никому не приходило в голову считать, сколько же воды через эти «общественные» краны утекало.

А вот когда коммунальщики начали работать в условиях жесткойэкономииинеучтенные реки, льющиеся из колонок, угрожали основательно подмочить финансовое положение предприятий ЖКХ, пришлось задуматься. Чтобы сократить потери, сеть колонок взялись, как сейчас принято говорить, оптимизировать…

Такая работа в стране ведется уже около трех лет. Не все это одобряют. Когда закрывать колонки на ключ начали в Городокском районе, местные жители стали жаловаться. Звонили люди и в витебский корпункт «СБ». Чтобы разобраться в ситуации, наш корреспондент отправился в Городок.

На улице Воровского я встретил Зинаиду Коваленко. Одинокая 80–летняя пенсионерка, живущая в частном доме, рассказала, что недавно на несколько дней осталась без воды. Дело в том, что водоразборную колонку, которой пользуется Зинаида Егоровна, местные коммунальщики закрыли на ключ. К рычагу приварили гайку.

По бокам — две дужки с отверстиями. В отверстия и гайку продет амбарный замок. Ключ от замка у Зинаиды Егоровны, заключившей договор с Городокским предприятием котельных и тепловых сетей на пользование колонкой, имеется. Однако, жалуется она, пожилому человеку не всегда удается замок отпереть. Бывает, что приходится откладывать приготовление обеда и стирку либо ждать, пока кто–то из прохожих поможет справиться с неподатливым замком. Есть, правда, еще один вариант: сходить за водой в соседнюю многоэтажку.

Всего в Городке 99 водоразборных колонок. Треть из них уже на замке. Как, например, в частном секторе на улице Галицкого. Местный житель Виктор Майоров, электромонтер, рассказал, что более полувека живет в частном доме без водопровода:

— Ключ от замка коммунальщики сами принесли. За пользование колонкой здесь я, наверное, один плачу. У соседей либо водопровод, либо колодцы. В месяц 1 рубль 19 копеек вместе с вывозом мусора получается. Цена приемлемая. Новшество сильно не напрягает. Вот только зимой замок замерзает... За водой приходится идти с зажженной газетой, как с факелом…

Кто и за что платит, я выяснил в Городокском предприятии котельных и тепловых сетей. По словам начальника участка водоснабжения Романа Колцы, по норме в сутки человек, заключивший договор на пользование колонкой, имеет право набрать 50 литров воды:

— В месяц получается 1,5 куба. Стоит это 0,8 рубля на одного прописанного в жилище. Хотя сколько реально человек выливает воды из колонки, отследить невозможно. Взял он, к примеру, 50 литров в день, полил огород у дома или увез на дачу бочку в 600 литров, мы не знаем. А неучтенные потери воды оборачиваются нашими убытками.

Ирина Казакова, заместитель директора Городокского предприятия котельных и тепловых сетей, рассказала, что если раньше допустимый процент потерь равнялся 25, то сейчас он снизился до 12…

--Чтобысократитьнеучтенный расход, по согласованию с Городокским райисполкомом мы стали запирать колонки на ключ. Количество заключенных договоров на пользование колонками после этого, к слову, выросло процентов на 7. Но это — часть решения проблемы. Идеальный вариант — избавиться от колонок вовсе. А людям в дома провести водопровод и установить там счетчики. Тогда каждый будет платить за то, что использовал.

ГородокскоеПКиТСпланирует повесить замки на все колонки в районном центре и крупных агрогородках. В Пальминке, Езерище и Бычихе, по словам Ирины Казаковой, работа уже ведется. Что же до деревень, где остались 4 — 5 пенсионеров, их начавшаяся кампания вряд ли коснется. Старики, говорят коммунальщики, много воды не выльют. Но вот дачники, приезжающие туда на лето, — проблема.

У меня все это, если честно, вызывает двоякое чувство. Да, экономить надо. Но когда вы едете по шоссе, видите возле него колонку, которая вроде бы стоит там для всех, а она — на замке, возникает ощущение, что это чья–то злая шутка. «Теперь в жару и глотка воды не сделаешь! Что еще у нас планируют закрыть на замок?» — с сарказмом спрашивали некоторые жители Городка. Очевидно, что новшество в райцентре не все восприняли с энтузиазмом. К примеру, у городской бани замок с колонки сорвали. И это уже не первый случай. «Так поступают те, кто за воду платить не хочет», — утверждают коммунальщики. А может, это те, кто воду — природное богатство — считает общим достоянием и полагает, что закрывать ее на ключ не следует?..

(сокращено)

Сергей Голесник
«СБ»

КРЫЗІС УЛАДЫ

ЛУКАШЭНКА ПАЧЫНАЕ РАБІЦЬ УСЁ БОЛЬШ ПАМЫЛАК

Падзеі пятніцы, суботы і нядзелі, калі ў некалькіх гарадах Беларусі працягваліся акцыі пратэсту, якім спадарожнічалі арышты лідэраў і актывістаў апазыцыі, дазваляюць зрабіць некаторыя важныя высновы пра грамадзка-палітычныя працэсы ў краіне.

1. Рашэньне Лукашэнкі аб прыпыненьні рэалізацыі дэкрэту аб дармаедах не спыніла пратэставага руху, ня зьбіла актыўнасьці людзей у рэгіёнах. Што толькі пацьвердзіла здагадку, што дэкрэт «аб дармаедах» стаў толькі дэтанатарам, каталізатарам, спускавым кручком шырокага незадаволеньня ў грамадстве сацыяльна-эканамічным станам. Магчыма нават, што частковае адступленьне ўладаў наадварот, натхніла людзей, зрабілі іх больш сьмелымі.

2. Беларускае грамадзтва пазбаўляеццаад«сындрому Майдану», то бок страху перад забурэньнямі ў выніку вулічных акцый.

3. Падзеі лютага-сакавіка сталі канцом ідэалягічнага канструкту пра знакамітую беларускую стабільнасьць.

4. Эканамічны крызыс перарос у сацыяльны. Адбываецца хутка грамадзкае абуджэньне і палітызацыя насельніцтва, чаго ўлады імкнуліся пазьбегнуць нават падчас выбарчых кампаніяў.

5. Лукашэнка, выступаючы на нарадзе 9 сакавіка, заявіў, што дэкрэт № 3 «не зьяўляецца ні эканамічным, не фінансавым», «гэта ідэалягічны, маральны дэкрэт». То бок ён прызваны быў прымусіць дармаедаў працаваць і тым самым аднавіць сацыяльную справядлівасьць. Але парадаксальным чынам усё адбылося з дакладнасьцю да наадварот. Гэты дакумэнт як раз ударыў па маральным аўтарытэце ўладаў і па Лукашэнку, ў прыватнасьці, спарадзіў этычны крызыс у адносінах паміж дзяржаваю і народам. Бо абʼяўляць дармаедамі людзей, якія апынуліся ў бядзе, бяз працы, ды яшчэ прымушаць іх плаціць за гэта штраф, насельніцтва палічыла дзікай несправядлівасьцю. А несправядлівасьць улады — гэта ідэалягічная дамінанта любой рэвалюцыі.

6. Тое, што рэй вулічных акцыяў вядуць рэгіёны, а не адна сталіца, як было раней, сьведчыць пра агульнанацыянальны характар беларускага крызысу. Ён закрануў усіх.

7. Затрыманьні, часам прэвэнтыўныя, лідэраў і актывістаў апазыцыі сьведчаць пра канец таго пэрыяду лібэралізацыі, які цягнуўся зь лета 2015 г. Сілавыя структуры выконваюць загад Лукашэнкі адсекчы «майданутых» ад шараговых удзельнікаў акцыяў. Аднак улады пакуль унікаюць масавых «хапуноў», «зачыстак», як тое было пасьля 19.12.2010 г. ці падчас кампаніі «Рэвалюцыя праз сацыяльныя сеткі» (2011 г.) зь некалькіх прычынаў. Па-першае, у правінцыі, раённых цэнтрах можа элемэнтарна не хапіць міліцыянтаў для такіх зачыстак. Па-другое, уладам ня хочацца псаваць адносіны з Захадам у момант, калі ідуць перамовы аб крэдыце МВФ. Па-трэцяе, і гэта галоўнае, масавыя рэпрэсіі супраць шараговых пратэстоўцаў будуць нэгатыўна ўспрынятыя большасьцю насельніцтва.

І гэта шматкроць узмоцніць ідэю несправядлівасьці ўлады, разбурыць яе легітымнасьць.

8. Лукашэнка, апынуўшыся ў сытуацыі крызысу, пачынае рабіць усёбольш памылак. Паўмера (прыпыненьне рэалізацыі, а не адмена дэкрэту аб дармаедах) ня вельмі дапамагла яму зьберагчы аблічча, а зь іншага боку, пацьвердзіла, што ўлада памылілася, што людзі, якія пратэстуюць, маюць рацыю, што рэжым не такі моцны і страшны, як уяўлялася. Да таго ж гэтае рашэньне паставіла ў недарэчную сытуацыю тых людзей, якія спужаліся і ўжо заплацілі падатак «на дармаедзтва».

А чаго вартыя загады «кроў з носу» давесьці сярэдні заробак да 500 даляраў ці ліквідаваць да 1 траўня беспрацоўе ў краіне? На нарадзе 9 сакавіка Лукашэнка загадаў прыцягнуць да рэалізацыі гэтага дэкрэту ня толькі адміністрацыю прэзыдэнта, урад, але і кіраўнікоў мясцовай вэртыкалі. «Прыцягнуць трэба ўсіх: дэпутатаў мясцовых саветаў, міліцыю, участковых, спэцслужбы», — заявіў ён. То бок увесь дзяржаўны апарат мабілізаваны на ўвесь год на выкананьне гэтага дакумэнту. Усё дзяржаўнае кіраваньне арыентаванае на вырашэньне адной задачы. Усе астатнія справы закінутыя. Параліч дзяржаўнага апарату падчас крызысу — справа ня толькі неразумная, але і небясьпечная.

9. Апазыцыя зноў ператвараецца ў субʼект палітыкі. Як піша намесьнік старшыні АГП Васіль Палякоў, «упершыню за многія гады дэмакратычная апазыцыя аказалася па адзін бок барыкадаў з большасьцю беларусаў, і гэта ўнікальная сытуацыя».

10. Крызыс беларускай сацыяльнай мадэлі цяпер падмацоўваецца ня толькі сухімі статыстычнымі паказьнікамі, але ўжо і публічнай дэманстрацыяй шырокага незадаволеньня насельніцтва. Што, дарэчы, парадаксальным чынам можа стаць штуршком для рынкавых рэформаў. Бо пакуль народ маўчаў, Лукашэнка мог кіравацца прынцыпам: не будзі ліха, пакуль ціха. Цяпер жа рызыкі ад захаваньня статус-кво ўжо зраўняліся з рызыкамі ад магчымых рэформаў.

Падаецца, Беларусь уступае ў нейкі новы, яшчэ не зусім зразумелы этап сваёй гісторыі.

Валер Карбалевіч
"Радыё Свабода"

КАНЕЦ ЛІБЕРАЛІЗАЦЫІ

ИГРАТЬ В ЛИБЕРАЛИЗАЦИЮ СИСТЕМА ЛУКАШЕНКО НЕ ПРИУЧЕНА

Идеология застойной стабильности провалилась, а игры в «диктатуру с человеческим лицом» неуклюжи и недолги. На опасность система будет реагировать запугиванием политических противников и народа.

На дворе весна, но чахоточная белорусская политическая оттепель может вот-вот быть свернута. Начались точечные репрессии против оппонентов, прежде всего с организаторским потенциалом, способных раскрутить протесты против декрета № 3. Их сюжет, кроме всего прочего, показал, что вертикаль не умеет говорить с народом, а государственная идеология, которую столько лет пытался взлелеять лично Александр Лукашенко, — пустой звук.

Показанный же вечером 6 марта по каналу «Беларусь 1» «специальный репортаж» «Звонок другу» напомнил о наиболее мрачных временах зубодробительной пропаганды.

Между тем на внешнем фронте сами власти получают болезненные удары от Москвы. 7 марта в Бишкеке на заседании Евразийского межправительственного совета российский премьер Дмитрий Медведев жестко отреагировал на критику из уст белорусского коллеги Андрея Кобякова. Тот пенял на поведение Москвы в нефтегазовом споре: мол, не соблюдаете договоренности по условиям поставок энергоносителей и пр.

В ответ Медведев заявил: «Давайте прямо, без обиняков, если бы некоторые страны, присутствующие здесь, не входили в состав нашего союза или вышли бы из него, они покупали бы сейчас газ по европейским ценам... И не надо ничего доказывать и упражняться в подсчетах, все было бы гораздо дороже». Резюме российского премьера оказалось и вовсе суровым: «Здесь никто никого насильно не держит».

Итак, на глазах разрушается один из стержней белорусской государственной идеологии — миф о нерушимом братстве с Россией и сияющих перспективах евразийской интеграции. Сегодня идеологи Лукашенко в ступоре, они не знают, как реагировать на вызовы момента, внутренние и внешние.

Желудочная философия мстит

Но сегодня убогая доктрина чарки и шкварки, игравшая сугубо на желудочном интересе, рассыпается. Если взять протесты «дармоедов», то людей вывел на улицы не только декрет № 3, но и прежде всего — экономический кризис. По большому счету, протестует электорат Лукашенко, возмущенный тем, что власть нарушила социальный контракт, заключавшийся в том, что она дает чарку и шкварку, а народ не бунтует.

Проблема для режима не столько в нынешних протестах (их сейчас пытаются погасить дозированными репрессиями и переписыванием злосчастного декрета), сколько в коллапсе экономической модели, основанной на массиве госсобственности и потреблении дешевых российских энергоресурсов.

Если вернуться к названным в 2003 году трем источникам белорусской госидеологии, то сейчас, по идее, нужно резко уходить от «совка», переступать через консерватизм и расширять поле для либерализма. Но это непросто «отказ от святого», это еще и большие практические риски для авторитарной системы. Ведь раскрепощение производительных сил и общества неизбежно станет расшатывать ее устои.

Каша в чиновничьих головах

В окружении Лукашенко пытаются как-то отвечать на вызовы времени. «Большой разговор с президентом» 3 февраля стал некой заявкой на подобие диалога с обществом, включая умеренных оппонентов режима.

Но зарегулированное, имитационное мероприятие показало прежде всего боязнь, как бы процесс не вышел из-под контроля. «Большой разговор» превратился в рекордно долгий монолог все того же главного действующего лица. Нетрудно спрогнозировать, что таким же имитационным оказался бы в сегодняшних условиях и некий круглый стол, идею которого было модно обсасывать в последние недели.

Ряд аналитиков предсказывает дрейф режима в сторону мягкого национализма. Да, предпосылки для этого есть. Русификация страны была для Лукашенко козырем в период «братской интеграции» (мы один народ, вместе гнили в окопах, поэтому не скупитесь на дешевую нефть и газ). Но после крымско-донбасских событий наверху поняли, что дефицит национального самосознания — ахиллесова пята.

Была дана отмашка на мягкую белорусизацию. На днях Лукашенко призвал хорошенько прописать в учебниках древние истоки белорусской государственности — начиная от Полоцкой земли. Неожиданная уступка в вопросе Куропат (остановлена стройка, госСМИ заговорили о необходимости создать мемориал, генерал КГБ публично осуждает политические репрессии сталинского времени) тоже симптоматична.

Можно представить себе, какая каша сейчас в головах чиновников — цивильных и в погонах. Все смешалось в доме Облонских.

Сегодня вся официозная мифология рушится. Но для того чтобы сплотить общество на иной идейной основе, нужно в первую очередь менять экономическую и политическую модель. Строить рыночную, демократическую, европейскую по духу Беларусь.

Однако очень уж велики сомнения, что Лукашенко настолько готов переступить через себя. Поэтому режим будет маневрировать, в том числе и в плане идеологическом. Мы еще увидим причудливые комбинации формы НКВД и вышиванки.

При этом раз за разом приходится убеждаться: когда наверху чуют опасность, игры в либерализацию и диалог быстро сворачиваются. Получайте сапогом в морду.

(сокращено)

Александр Класковский
naviny.by

“ЖАННА Д’АРК” ПРАТЭСТА

«Я ИЗ НАРОДА, НО У МЕНЯ ХАРАКТЕР НЕРАВНОДУШНЫЙ»

Светлана Ботвич — 38-летняя уборщица в детском садике — стала одной из самых ярких фигур на массовой акции протеста, которая прошла в северном областном центре 26 февраля. Женщина решительно выходила вперед и произносила довольно смелые вещи. С легкой руки журналистов ее назвали «витебской Жанной д’Арк». TUT.BY пообщался со Светланой и узнал, что привело ее на митинг и не имеет ли это каких-либо последствий.

Светлана Ботвич не состоит ни в каких партиях, оппозиционных движениях или организациях. Самый что ни на есть человек из народа. На уличную акцию вышла впервые. А привела ее туда, по ее словам, «обида за белорусский народ» и «несправедливость, с которой к нему относится власть».

— Я всегда интересуюсь тем, что происходит в стране. О том, что в нашем городе пройдет акция, узнала из соцсетей. И впервые за свои 38 лет решила выйти на уличный протест, так как у меня характер — неравнодушный. Я такая: если надо в ружье — я в ружье, надо на работу — я на работу. Если вижу несправедливость, молчать не стану.

Декрет № 3 «О предупреждении социального иждивенчества» не затронул саму Светлану. «Мои деньги не пахнут. Я работаю уборщицей в детском садике, а до этого много лет была санитаркой в онкодиспансере». Письмо с требованием уплатить налог на тунеядство пришло ее мужу.

Светлана несколько раз поднималась на импровизированные трибуны на ступенях — сразу на площади Победы, а потом — возле здания филармонии.

— Чиновники все одеты, обуты, у них есть машины, дачи… А мы? Сколько можно терпеть эту несправедливость? Наши деды и прадеды отстояли страну от фашистов, чтобы мы вот так жили? Я пришла сказать: так неправильно жить! — возмущалась молодая женщина. — Уважаемый Александр Григорьевич, устали люди. Уступите путь, место, дорогу молодежи, чтобы наши мужья не уезжали далеко (в поисках работы. — Прим. TUT.BY). Дайте им работу!

— Может, поначалу мне и было страшно, но потом другие эмоции захлестнули страх. Я выговорилась. И очистилась, как говорят в церкви, — признается Светлана. — Мне показалось, что люди ждали, чтобы кто-то вышел вперед и что-то сказал. Я дала толчок, и в следующий раз, думаю, таких «Светлан из народа» будет много. Люди просыпаются.

— Вас же называют «витебской Жанной д’Арк», вы в курсе?

— Соседи мне вот тоже говорят: «Какая ты молодец! Мы бы не осмелились так выступить». Но, знаете, я это делала не для того, чтобы мной восхищались. Мне за державу обидно. Беларусь мне видится красивой, чистой страной, где должны уважать человека. Наши люди действительно достойны лучшей жизни, — в голосе женщины слышны слезы.

Светлана с мужем воспитывают одного ребенка. «Родила бы и больше. Но думаешь: а хватит ли средств прокормить? Моя зарплата сейчас 230 рублей»….

Татьяна Матвеева



СУАЙЧЫННІКІ! СА СВЯТАМ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ РЭСПУБЛІКІ!



БЯСПАМЯЦТВА

БЕЛОРУСЫ ПО МИРОВЫМ МЕРКАМ — ОЧЕНЬ ДРЕВНИЙ НАРОД

«Трудно еще найти в мире народ с такой искалеченной исторической памятью, как белорусы». Политолог Валерий Карбалевич — о том, кто виноват в коллективном беспамятстве.

4 марта Беларусь торжественно отметила 100-летие белорусской милиции. Праздновали помпезно, с парадом, несколько вечеров перекрывали движение на главном проспекте столицы для репетиции.

Свое рождение милиция отсчитывает с событий в Минске 4 марта 1917 года, когда после получения информации об отречении от престола царя Николая II группа людей захватила здание полиции. Правда, на самом деле, с учетом перехода на новый стиль, 100 лет исполняется 17 марта. Подумаешь, перепутали, ошиблись на две недели...

Более интересно другое. Никому не приходит в голову простой вопрос: а до 1917 года здесь не существовало органов охраны порядка? Пусть и назывались они по-другому.

Торжественное празднование этого юбилея позволяет еще раз обратить внимание на удивительный феномен. Белорусское общество и государство отсчитывают свою историю с 1917 года. Все официальные белорусские праздники — советские: День Октябрьской революции, 1 Мая, 8 Марта и пр.

23 февраля официально отмечается День защитников Отечества и Вооруженных сил Республики Беларусь. Этот праздник остался от СССР, считается, что в этот день в 1918 году родилась Красная армия. Опять же возникает вопрос: а до 1918 года у белорусов не было своей армии, они ни с кем не воевали, не одерживали победы? А еще отмечаются советские праздники — День пограничника, День ВДВ (это когда пьяные десантники купаются в фонтанах) и др.

Но дело не только в праздниках. Посмотрите, какие памятники стоят на центральных площадях наших городов, в честь кого названы улицы. А названия станций метро: Площадь Ленина, Октябрьская, Пролетарская, Первомайская, Парк Челюскинцев, Московская…

Создается полное впечатление, что до 1917 года здесь, на этой территории, никто не жил. То ли это была необитаемая земля, то ли люди, здесь жившие, не оставили о себе никаких следов, ни памятников, ни потомков.

На самом деле белорусы по мировым меркам — очень древний народ. Они проживают здесь свыше тысячи лет. Например, 3 марта исполнилось 950 лет г. Минску. История города отсчитывается с первого летописного упоминания о нем. 3 марта 1067 года во время битвы на Немиге возле Минска киевские князья победили полоцкого князя. Немногие города в мире могут похвастаться такой древней историей. Но вместо всенародного празднования 950-летия своей столицы, власти торжественно отметили придуманную дату: 100-летие белорусской милиции.

Трудно еще найти в мире народ с такой искалеченной исторической памятью, как белорусы, людей, не помнящих своего родства. И главная вина за это коллективное беспамятство лежит на государственной власти, которая зациклена на советском прошлом. Приезжающие сюда иностранцы называют Беларусь «осколком СССР», «парком советского периода» и пр.

В момент обострения конфликта вокруг Куропат, когда представители общественности защищали его от строителей бизнес-центра, в редакции газеты «Советская Белоруссия» состоялся «круглый стол» на тему судьбы этого мемориала. Событие весьма знаменательное.

Главный вывод участников «круглого стола» состоит в том, что белорусское общество созрело для создания национального мемориала скорби и памяти в Куропатах. На наш взгляд, общество как раз давно созрело, все дело упиралось в позицию власти, именно она никак не могла созреть. Прозвучало обвинение в адрес оппозиции, что она, дескать, «приватизировала» Куропаты, и пора этот мемориал «национализировать». Но дело в том, что демократическая общественность именно потому защищала Куропаты и фактически спасла мемориал, что власти от него отреклись, фактически не признавали, он был ничейным.

И здесь, как и в других вопросах, все зависело от позиции Александра Лукашенко. Прокуратура пробовала доказать, что в Куропатах расстреливал не НКВД, а гестапо в годы войны. Еще три раза (!) проводилось официальное расследование, делались раскопки. Однако они лишь подтвердили прежние выводы: людей расстреливал НКВД.

Но, тем не менее, Лукашенко Куропаты так и не признал. Мемориал посещают приезжающие в Беларусь делегации разных стран. Весьма знаменательным и одновременно парадоксальным является тот факт, что единственный мемориальный знак здесь установил президент США Билл Клинтон. А президент Беларуси ни разу не посетил Куропаты. Не было здесь и официальных визитов с венками белорусских чиновников.

Власти взяли курс на замалчивание сталинских репрессий. Был полностью закрыт архив КГБ, все дела о страшной трагедии 30—50-х годов вновь засекречены. В школьных учебниках сталинские репрессии представлены как необходимая мера защиты советской власти в тот исторический период.

Зато официальным мемориалом, куда возят на автобусах детей и школьников, стала «Линия Сталина». В 2006 году Александр Лукашенко заявил: «Нам навязывают, чтобы мы забыли все великое, что сделали Ленин и Сталин, а ведь это — символы нашего народа» («Комсомольская правда в Белоруссии», 2006, 20 июня).

На официальном уровне настойчиво выпячивается историческая преемственность нынешних белорусских органов госбезопасности и силовых структур с их зловещими предшественниками. Беларусь — единственная посткоммунистическая страна, где КГБ сохранил свое старое название. Торжественно отмечаются юбилеи этой организации, а также годовщины со дня рождения основателя советских карательных органов Ф. Дзержинского.

На этом фоне призыв «Советской Белоруссии» превратить Куропаты в «национальный мемориал скорби и памяти» является несколько неожиданным. Главный редактор Павел Якубович отметил, что это уже его вторая попытка. Первая была семь лет назад. Тогда был проведен аналогичный «круглый стол», на котором звучали подобные предложения. Он с сожалением отметил: «Но все это как в воду утекло. Мы тогда обратились к Минскому облисполкому — надо благоустроить, облагородить Куропаты, взять их под охрану и т. д. Власть, к сожалению, не особо прислушалась».

И это вполне закономерно. Ибо «Линия Сталина» и проспект Дзержинского в Минске как-то плохо сочетаются с мемориалом, посвященным жертвам советских репрессий. Не уверен, что новая попытка будет успешнее.

Валерий Карбалевич
gazetaby.com

Заснавальнік і рэдактар: Гаравы Леанід Антонавіч

Адрас рэдакцыі: 211573, г. Гарадок, вул. Гагарына, д.30Б, кв.16. E-mail: 250318@list.ru
Тэл. 8-02139-5-08-52, маб. + 375(29)6723842 (V),
Газета выдаецца з сакавіка 1998 г.

Падпісана да друку 16.03.2017 у 18.35
Наклад: 290 асобнікаў.
Выдаецца адзін-два разы на месяц на беларускай і расійскай мовах.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Друкуецца на абсталяванні аднадумцаў.
Распаўсюджваецца бясплатна дабраахвотнікамі.